# Выбіраем разам

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

## Чаму ёсць упэўненасць, што новы дэпутацкі корпус будзе якасны, і якой увойдзе ў гісторыю гэта электаральная кампанія

Нашы чытачы ўбачаць гэты нумар яшчэ да адзінага дня галасавання. Не выключаю, што нямала сярод іх будзе і тых, хто возьмецца за часопіс пасля 25 лютага, калі ўжо стануць вядомы папярэднія вынікі выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў. Па праўдзе кажучы, у гэтым ёсць свой несумненны плюс: можна супаставіць уласныя назіранні і думкі з маімі меркаваннямі і разважаннямі, пераканацца, ці меў рацыю аўтар гэтых радкоў альбо ў чымсьці памыляўся.

Усё больш упэўніваюся, што беларусы выберуць вельмі якасны склад заканадаўчага і прадстаўнічых органаў улады. Не таму, што ў нас Год якасці і мне раптам захацелася неяк абыграць гэты момант на прыкладзе электаральнай кампаніі. Ёсць аб’ектыўныя фактары, якія паспрыяюць такому ае зыходу, з імі не паспрачаешся. І ўзніклі яны не самі па сабе, а дзякуючы найперш пазіцыі кіраўніка дзяржавы, які падчас яшчэ чэрвеньскай сустрэчы са старшынёй Цэнтрвыбаркама выразна акрэсліў галоўную задачу – правесці гэтыя выбары сумленна, стварыць належныя ўмовы для таго, каб людзі змаглі свабодна і спакойна, асэнсавана выбраць самых вартых адказнай дэпутацкай місіі грамадзян.

Ужо на этапе вылучэння кандыдатур з’явілася цвёрдая ўпэўненасць, што выбарчая кампанія

**У лютым па ўсёй краіне разгарнулася маладзёжная акцыя: кожны мог бясплатна адправіць сваім родным і знаёмым спецыяльную паштоўку-запрашэнне на выбары**






будзе як мінімум не падобная да папярэдніх. Упершыню краіна адначасова абярэ адразу ўвесь дэпутацкі корпус – ад мясцовых Саветаў да Палаты прадстаўнікоў у парламенце, і сам па сабе такі фармат, несумненна, стварыў шэраг новых нюансаў, найперш у арганізацыйным і інфармацыйным планах. Зрэшты, з імі паспяхова справіліся. І тут трэба аддаць належнае Цэнтрвыбаркаму, які праявіў надзвычайную адкрытасць, імкнучыся зацікавіць грамадзян, асабліва моладзь, выбарчым працэсам. Але размова не пра тое.

У снежні мне давялося прысутнічаць на з'ездзе адной з чатырох палітычных партый. На ім зацвярджалі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Шчыра скажу: у той момант не хацеў бы апынуцца на іх месцы – настолькі прынцыпова, часам нават прыдзірліва «прасвечвалі» кожнага прэтэндэнта. Гучалі і досыць няёмкія, як падалося, пытанні. «А што тут такога? – зрэагаваў адзін з удзельнікаў з'езда на маю заўвагу, што няварта было так чапляцца да людзей. – У сваіх дэпутатах павінны быць упэўнены на ўсе сто». Трапна парыраваў – не ў брыво, а ў вока.

Быць упэўненымі на ўсе сто жадалі і працоўныя калектывы, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у вышэйшы заканадаўчы орган краіны і ў мясцовыя Саветы, і звычайныя людзі, што ўласнымі подпісамі паручыліся за землякоў, а потым падтрымлівалі іх на рознага кшталту агітацыйных мерапрыемствах. А грамадскія арганізацыі, прафсаюзы, асобныя ініцыятывы?! Дакладна ніхто не заставаўся ўбаку.

Грамадская актыўнасць – яскравы штрых гэтай выбарчай кампаніі, і не сумняваюся, што такой яна ўвойдзе ў гісторыю нашай Беларусі. Напэўна, крыху пазней вучоныя і эксперты яшчэ паразважаюць пра гэты феномен, аперыруючы дакладнымі лічбамі і першакрыніцамі. Але, безумоўна, сучасны трэнд грамадска-палітычнага жыцця вызначаецца тым, што ўсё большая колькасць беларусаў разумеюць: электаральны суверэнітэт – гэта не толькі пра палітыку. Гэта зямное, гэта безумоўны складнік жыцця. Магчымасць свабодна і сумленна выбіраць, каго лічым патрэбным, і ўладкоўваць жыццё ў краіне так, як разумеем самі, без настойліва-нахабных падказак і парад звонку – гэта своеасаблівы знак якасці для любой краіны і яе насельнікаў.

Хто б што ні плявузгаў на розных сумнеўных рэсурсах, выбары-2024 у Беларусі канкурэнтныя нават на ўзроўні мясцовых Саветаў, не кажучы ўжо пра Палату прадстаўнікоў. Гэта неаспрэчны факт. Напрыклад, на Віцебшчыне на 14 месцаў у Авальнай зале прэтэндуюць 33 кандыдаты. І падобны канкурэнтны расклад ва ўсіх рэгіёнах краіны. У выніку маем наступную карціну: 110 парламенцкіх мандатаў і 265 прэтэндэнтаў. Цікава, што сярод кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў тры чвэрці партыйцаў: 112 членаў партыі «Белая Русь», 33 – Камуністычнай партыі Беларусі, 36 – Ліберальна-дэмакратычнай партыі, 22 – Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці. Заўважу, што вылучалі іх не толькі ўласна партыі, а і працоўныя калектывы, і самі яны з дапамогай ініцыятыўных груп збіралі подпісы ў сваю падтрымку. Так ці інакш, але зразумела: палітычныя структуры ўспрынялі заклік Прэзідэнта аб'ядноўваць грамадства і канкурыраваць на ўзроўні праектаў, заканадаўчых ініцыятыў як інструкцыю да актыўных дзеянняў і спаўна рэалізавалі свае амбіцыі падчас электаральнай кампаніі. Паглядзім, што вырашаць выбаршчыкі.

Да таго ж, як ужо згадвалася, усе кандыдаты ў дэпутаты, перш чым з'явіцца на агітацыйных плакатах і ў бюлетэнях для галасавання, прайшлі грунтоўны не толькі партыйны, а і грамадскі фільтр. Сярод іх дакладна няма выпадковых, без прыкмет дзяржаўнага мыслення асоб. Мяркую, што дзе-нідзе выбаршчыкам нават давядзецца добра памазгаваць, каму з супернікаў аддаць перавагу. Але людзі нашы разумныя, разбяруцца. Галоўнае – ёсць выбар.

Думаю, пасля 25 лютага мы ўсе будзем крыху іншымі – больш дасведчанымі і адказнымі, зарадзімся новай сілай аптымізму і ўпэўненасці ў шчаслівым лёсе роднай Беларусі.

…Якраз у той момант, калі пісаў гэтыя радкі, на тэлефон прыйшла эсэмэска. Чытаю: «Шаноўны выбаршчык! Запрашаем Вас прыняць удзел у выбарах дэпутатаў 25 лютага…». Прыемна, аднак, што ні кажы.

Абавязкова пайду. Бо адчуваю сябе часцінкай адзінай краіны і адзінага народа.

***Ігар ГАНЧАРУК***